Каваленак Н., студ. 4-га курса ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навучны кіраўнік – Смолік А.І.,
докт. культуралогіі, прафесар

# ТРАНСМІСІЯ КУЛЬТУРНАГА ВОПЫТУ Ў ПЕРШАБЫТНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Першы этап абшчынага ладу ў гісторыі, з яго адносна прымітыўнымі формамі жыццядзейнасці і раннеродавымі сацыяльнымі ўзаемаадносінамі, тым не менш, быў крокам наперад у ажыццяўленні грамадскага выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Асноўным зместам дадзенага адрэзку генезісу і эвалюцыі выхавання і адукацыі было запашванне ведаў пра навакольнае асяроддзе, навыкаў выканання розных бытавых спраў, сацыяльных узаемаадносін, стваральна-назапашвальнай і здабытковай дзейнасці, элементарных абрадавых дзеянняў і іншых форм. Умацоўвалася эканамічнае становішча грамадства. Пашыраўся светапогляд, удасканальвалася фізічная канстытуцыя і паглыбляўся сацыяльны статус старажытных людзей [7, 53-57].

Так, сам выхаваўча-адукацыйны працэс першабытнай раннеродавай абшчыны ажыццяўляўся, акрамя паўсядзённага неўсвядомлена-жыццёвага назапашвання індывідуальнага вопыту, галоўным чынам, у працэсе абраднасці (паляўніча-рыбалоўчай, вытворчай, бытавой, рэлігійна-ідэалагічнай і інш.), з выкарыстаннем выяўленчага мастацтва. Спецыфічнай рысай гэтага перыяду яго эвалюцыі была рытуальна-стэрэатыпная сутнасць, пры якой навучаннем і выхаваннем (трансляцыяй вопыту) ахопліваліся як дзеці, так і дарослыя. Гэтым замацоўвалася адзінства ведаў раннеродавай абшчыны пра навакольнае асяроддзе, агульнасць грамадскіх інтарэсаў і непадзельнасць колькаснага складу ўменняў і навыкаў, вядомых той ці іншай першабытнай грамадскай супольнасці [3,135].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увесь вопыт жыцця і дзейнасці: стварэнне прылад працы і жытлаў, ідэалогія, сацыяльныя ўзаемаадносіны, спосабы здабычы харчавання, выхаванне дзяцей, шлюбна-палавыя адносіны і іншыя формы жыццядзейнасці – рэгуляваўся звычаем і табу як формай абмежавання рамак чалавечага пазнання, магчымасцей і дасягненняў соцыуму на пэўным этапе яго развіцця.

Станаўленне першых прыкмет ініцыяцый (спачатку толькі як форм мэтанакіранага экзаменавання падлеткаў пры пераходзе іх у дарослы перыяд жыцця) падчас эпохі першабытнай раннеродавай абшчыны ішло па шляху трансфармацыі - ад міжасабовага саперніцтва самцоў-гамінідаў, у якім маладзейшыя асобіны з дапамогай фізічнай сілы павінны былі пастаянна даказваць свае права на падпарадкаванне дзяцей і жанчын, да фарміравання культу новых каштоўнасцей грамадства: разумовых, вопытна-ведавых, гутаркова-камунікатыўных і інш., якія пачалі таксама прэтэндаваць на роль «экзаменацыйных» пры пераходзе падлеткаў у стан дарослых людзей.

Пропп В.Я. выявіў што адной з маладаследаванных форм з'яўляецца падрыхтоўка падрастаючага пакалення ў так званых “ мужчынскіх”, ці “лясных” дамах. Увесь працэс перадачы жыццевага вопыту падрастаючым пакаленням па тыпу “ляснога дома”, можна умоўна падзяліць на тры ступені: 1. Пад аткрытым небам; 2. У лясной хатцы; 3. У лясных мужчынскіх доме [6, 63-73].

На кожным з этапаў названага выхаваўча-адукацыйнага працэсу меўся свой змест і свае метады навучання. Калі на першым этапе навучэнцы былі адны, і ім, хутчэй за ўсе, выкладалася такім своеасаблівым чынам, навука выжывання і самаабслуговання ў прыродных умовах, то на другім этапе разам з дзецьмі казкі называюць нейкага мудрага і добрага апекуна: гэта жрэц ці настаўнік.

Адразу пасля пераходу на другую ступень навучання ў “лясную хатку”, навучэнцы называюцца “дрываносцамі” гэта сведчыць, хутчэй за ўсе, пра нейкую градацыю навучальна-выхаваўчай падрыхтоўкі ў межах самой навучальнай ступені, што называлася лясная хатка, або пра іерархічнасць узаемаадносін, накшталт шырока вядомай у наш час дзедаўшчыны ў армейскіх калектывах [1, 94]. Былі навічкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дрываносцы, якія, напэўна, выконвалі самую чорную работу і якіх выхоўвалі перш за ўсе фізічнай працай па абслугованні ўсіх тых, хто пражываў у лясной хатцы. Мелася, мабыць, і старэйшая группа навучэнцаў, якія займаліся больш дасціпнымі (тэарэтычнымі) “навукамі”.

Для трэцяй ступені, па-першае, была характэрна жорсткасць умоў навучання. Тут некаторыя навучэнцы нават ахвяраліся сваім жыццем. Па-другое, адметнай рысай выхаваўча-адукацыйнай практыкі на дадзеным этапе было выкарыстанне як тэарэтычных, так і практычных метадаў падрыхтоўкі: турніраў, паедынкаў, змаганне паміж навучэнцамі і са знешнім непрыяцелем. Інакш кажучы, сярод заняткаў даволі значнае месца займала ваенная справа. Па- трэцяе, заняткі ў “мужчынскіх дамах” з’яўляліся сакрэтнай формай падрыхтоўкі. Кожны навучэнец даваў клятву маўчання, што было, на наш погляд, вельмі важным, асабліва для практыкі выхавання ў маладога чалавека ўласна мужчынскай псіхалогіі. І па-чацьвертае, у “мужчынскім доме”, на думку даследчыкаў, вучылі правілам узаемаадносін з супрацлеглым полам [5, 150-153].

Літаратура:


1. Лурье С.Я. Дом в лесу/ Лурье С.Я. // Язык и литература. Т.8. Л., 1932. С.163.
2. Палікарповіч К.М. Вынікі археалагічныхдаследаванняў Беларусі /Палікарповіч К.М. // Весці АН БССР.Сер.гістарычная. -1947.- №1.- 21с
3. Пілецкі В.А. Генезіс выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі: Пілецкі В.А.//Манагр.-Мн.: БДПУ,2004.-237с.
4. Пропп В. Я. «Исторические корни волшебной сказки»/ Пропп В. Я. // — Л. Изд-во ЛГУ, 1986 — 364 с.
5. Пропп В.Я. Мужской дом в русской сказке/ Пропп В. Я. // Ученые записки ЛГУ.-Л.,-1939.-Вып.1.-Т.№20.
6. Пряникова В.Г., Равкин З.И. История образования и педагогической


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мысли./ Пряникова В.Г., Равкин З.И. // - М.: 1994. - С. 63-73.

7. Якимов В. П. Ранние стадии антропогенеза. Происхождение человека и древнее расселение человечества/ Якимов В. П. // Труды Института этнографии. Новая серия. Т. 16. - М.: 1951, с. 53 - 57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ